РАДАСЦЮ, ШЧАСЦЕМ І БАГАЦЦЕМ НАПОУНЕНА СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

МЫ ПЕРАМОЖАМ

З рэзалюцыі мітынга рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых завода імені Варашылава

Прэзранныя польскія паны пазбавілі нашых братоў — працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны сваёй совецкай радзімы, захваціўшы іх у ланцугі кабалы і прыгнечання. Яны кінулі іх у крывавую мясарубку другой імперыялістычнай вайны.

Даведзеныя да галечы і разарэння, працоўныя Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны падымаюць сцяг вызваленчай вайны і рэволюцыйнага паўстання супроць сваіх прыгнятальнікаў.

Наша родная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія, верная ідэалам міжнароднай пролетарскай салідарнасці і брацтва народаў, урачыста ўступае на тэрыторыю Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, як на сваю родную зямлю.

Мы ідзем не як заваявальнікі, а як вызваленцы нашых братоў па класу — беларусоў, украінцаў і працоўных Польшчы, з якімі мы звязаны гістарычнымі ўзамі брацтва і барацьбы супроць прыгнятальнікаў.

Мы нясем ім поўнае вызваленне ад іга эксплаатацыі і нацыянальнага гнёту, мы нясем ім шчаслівае і радаснае жыццё.

Мы, рабочыя і служачыя, з пачуццём гордасці і вялікай радасці адказваем на заклік таварыша Молатава і лічым сваім свяшчэнным абавязкам перад нашай сацыялістычнай радзімай, — сваёй чэсной стаханаўскай работай, сваёй высокай свядомасцю дапамагчы нашай роднай і любімай гераічнай Чырвонай Арміі ў выкананні яе гістарычнай місіі. У любы момант мы гатовы па-баявому ўсе, як адзін, рашуча выступіць на абарону нашай сацыялістычнай радзімы і дапамагчы працоўным Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны і працоўным Польшчы вызваліцца ад іга эксплаатацыі і прыгнечання.

Поўныя рэволюцыйнага сацыялістычнага сазнання, бязмежнай любві і адданасці вялікай радзіме, вялікаму Сталіну, наша Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія, увесь наш совецкі народ выканае да канца свой свяшчэнны абавязак перад радзімай, перад працоўнымі ўсяго свету.

Мы ведаем, што абавязкова і напэўна пераможам, бо нас вядзе вялікі стратэг сацыялістычнай рэволюцыі, геніяльны маршал комунізма таварыш Сталін, бо на чале нашай доблеснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі стаіць яе выпрабаваны палкаводзец, першы маршал Совецкага Саюза таварыш Варашылаў.

Няхай жыве наша слаўная гераічная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія!

Няхай жыве мудры палкаводзец Арміі сацыялізма Клімент Ефрэмавіч Варашылаў!

Няхай жыве найвялікшы геній чалавецтва, вялікі маршал комунізма — родны, любімы Сталін!

КАЛГАСНАЕ ПРЫВІТАННЕ БРАТАМ ПА КЛАСУ

З велізарным натхненнем слухалі ўчора калгаснікі і калгасніцы сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны агароднік», Мінскага раёна, выступленне па радыё старшыні Соўпаркома СССР і Народнага Камісара па Замежных Справах Вячэслава Міхайлавіча Молатава. Кожнае мудрае слова главы Совецкага ўрада напаўняла сэрцы шчаслівых калгаснікаў патрыятычным пачуццём, гарачай любоўю да сваёй любімай сацыялістычнай радзімы, большэвіцкай партыі і вялікага Сталіна.

Ва ўсіх брыгадах калгаса адбыліся многалюдныя мітынгі. Калгаснікі і калгасніцы горача віталі заяву Вячэслава Міхайлавіча Молатава аб рашэнні Совецкага ўрада аказаць брацкую дапамогу працоўным Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў вызваленні ад іга польскіх паноў і капіталістаў.

— Мы з радасцю далучаемся да выступлення главы Совецкага ўрада, — заявіў на мітынгу брыгадзір першай агародняй брыгады тав. Ткачоў. — Тав. Молатаў выказаў думкі і пачуцці ўсяго вялікага 170-мільённага совецкага народа. Польскі ўрад абанкроціўся і аставіў краіну і народ на волю лёсу. Совецкі народ працягвае брацкую руку дапамогі рабочым і сялянам Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Наша доблесная Чырвоная Армія, уступіўшы на зямлю Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, якая з'яўляецца нашай роднай зямлёй нясе шчасце і радасць працоўным беларусам і украінцам.

— Мы шлем шчырае калгаснае прывітанне, — гаворыць у сваім выступленні калгаснік Міхаіл Васільевіч Чарняўскі,— братам па класу працоўным Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, якія вызваляюцца ад прыгнечання польскіх паноў і імкнуцца да такога-ж шчаслівага і радаснага жыцця, якім жыве наш совецкі народ. Мы цалкам і поўнасцю адабраем мерапрыемствы Совецкага ўрада.

Мы, калгаснікі, заўсёды гатовы па закліку партыі і ўрада стаць на абарону сваёй квітнеючай совецкай краіны.

У аднадушна прынятай рэзалюцыі калгаснікі і калгасніцы сельгасарцелі «Чырвоны агароднік» пішуць:

«Цалкам і поўнасцю адабраем мерапрыемствы Совецкага ўрада па аказанню брацкай дапамогі працоўным Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Мы яшчэ лепш будзем працаваць на нашых квітнеючых калгасных палях. Мы гатовы ў любую мінуту стаць на абарону сваёй дарагой радзімы і аказаць дапамогу нашым братам з Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Няхай жыве наша доблесная Чырвоная Армія!

Няхай жыве Народны Камісар абароны, першы маршал Совецкага Саюза таварыш Варашылаў!

Няхай жыве наша родная комуністычная партыя большэвікоў і яе мудры правадыр наш родны таварыш Сталін!».

МЫ НЯСЕМ ІМ РАДАСЦЬ І ШЧАСЦЕ

(Рэзалюцыя калектыва рабочых і служачых завода імені Дзімітрава).

МАГІЛЁЎ 17 верасня. Заслухаўшы паведамленне па радыё главы Совецкага ўрада і Народнага Камісара па Замежных Справах таварыша Вячэслава Міхайлавіча Молатава, агульны сход рабочых, ІТР і служачых завода імені Дзімітрава горача вітае і адабрае рашэнне Совецкага ўрада, накіраванае на вызваленне брацкіх народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ад іга польскіх памешчыкаў і капіталістаў, ад усякага нацыянальнага прыгнечання і бяспраўя.

У рашэнні, прынятым совецкім урадам, выражана наша брацкая салідарнасць і клопаты ўсяго нашага многанацыянальнага совецкага народа аб прыгнечаных братах па класу.

Мы яшчэ раз паказваем на справе ўсяму свету, што Совецкі Саюз ёсць аплот міру, што Совецкаму Саюзу чужда палітыка захватаў, насілля і прыгнечання, што вызваленчы рух прыгнечаных народаў заўсёды знойдзе гарачы водгук, сімпатыю і падтрыманне ўсяго совецкага народа.

Для паспяховага выканання пастаўленых перад доблеснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміяй задач калектыў нашага завода абавязваецца яшчэ лепш і ўпорней працаваць кожнаму на сваім месцы для выканання вытворчых заданняў, накіраваных да забеспячэння абароназдольнасці тыла і баявой магутнасці Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Мы запэўняем нашу партыю і ўрад, што заўсёды гатовы ў любую мінуту па першаму закліку стаць у перадавыя рады байцоў, якія нясуць поўнае вызваленне, свабоду, радаснае, шчаслівае жыццё нашым братам — працоўным Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Няхай жыве міжнародная салідарнасць працоўных усяго свету!

Няхай жыве Совецкі ўрад і яго глава Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў!

Няхай жыве наша вялікая непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і яе правадыр — першы Маршал Совецкага Саюза тав. Варашылаў!

Няхай жыве вялікая, магутная комуністычная партыя большэвікоў!

Няхай жыве наш любімы правадыр, настаўнік і бацька працоўных усяго свету таварыш Сталін!

ДЗЕ ПАНАВАЛА ГАЛЕЧА, ЗАКВІТНЕЕ ВЯЛІКАЕ ЧАЛАВЕЧАЕ ШЧАСЦЕ

Надышоў доўгачаканы, радасны, гістарычны дзень вызвалення народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Горача і сардэчна вітаем мы сваіх родных братоў, якія доўгія годы цярпелі нечалавечыя здзекі ад лютых паноў-памешчыкаў па вёсцы, ад кровежэрных фабрыкантаў ды іншых звярыных эксплаататараў працоўных у горадзе. Панскія жандармы, нібы раз'яроныя псы, учынялі ў мірны час налёты на беларускія і украінскія сёлы, не менш страшныя і дзікія, чым напады ворага ў часе вайны.

Беларускія і украінскія мястэчкі і гарады доўгі час стагналі пад несупынным гнётам белапанскай Польшчы. Былі задушаны жыццё, культура, родная мова і ганьбавалася дастойнасць чалавека, нібы ў жудасныя годы сярэдневякоўя. Беспрасветная цемра атрутным туманам вісела над краем.

Працоўныя Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны згалелі да шчэнту, зрабіліся жабракамі.

На крык паратунку кроўных братоў адклікнуўся, як адзін чалавек, увесь многамільённы вольны і шчаслівы совецкі народ. Гэта наш вялікі абавязак. Інакш мы не можам рабіць. Пад кіраўніцтвам мудрай партыі Леніна—Сталіна, па загаду Совецкага ўрада магутная, доблесная, непераможная Чырвоная Армія вырвала пагранічныя слупы і пайшла ратаваць родных братоў ад векавечнага панскага гнёту, ад нечалавечых пакут, ад страхаў, жудасцей і руйнаванняў вайны, ад знішчэння дзядоў, жонак і дзяцей.

Наша гераічная і слаўная Чырвоная Армія нясе вызваленне і радасць усім працоўным—рабочым, сялянам, інтэлігенцыі.

Ніякія межы, ніякія пагранічныя слупы больш не падзеляць, не пасякуць на часткі нашу родную зямельку. Нашыя родныя браты з Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны пры дапамозе Чырвонай Арміі вызваляюцца з векавечнай панскай няволі і становяцца гаспадарамі сваёй радзімы. Там, дзе панавалі голад, нястача і несупынная нядоля, — цяпер запануе радасць і вялікае чалавечае шчасце.

ЗМІТРОК БЯДУЛЯ,
Пісьменнік-ордэнаносец

—★—

ГОРАЧА ВІТАЕМ МУДРУЮ СТАЛІНСКУЮ ПАЛІТЫКУ

ГОМЕЛЬ, 17 верасня. Тысячы чыгуначнікаў Беларускай чыгункі слухалі па радыё прамову главы Совецкага ўрада Вячэслава Міхайлавіча Молатава.

У абедзены перапынак і пасля работы ва ўсіх падраздзяленнях адбыліся многалюдныя мітынгі. Рабочыя, інжынеры і тэхнікі, хатнія гаспадыні ў сваіх выступленнях і рэзалюцыях горача віталі мудрую сталінскую палітыку, адобрылі мерапрыемствы Совецкага ўрада, накіраваныя на выкананне абавязку перад братамі — беларусамі і украінцамі, якія гадамі знаходзіліся пад ігам польскіх паноў.

На мітынгу ў паравозным дэпо Гомель выступіў машыніст-крываносавец т. Крупадзёраў. Ён заявіў:

— Мерапрыемствы Совецкага ўрада па аказанню дапамогі нашым братам і сёстрам з Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны выражаюць волю ўсяго многамільённага совецкага народа. Яшчэ цяснейй згуртоўваючы свае рады вакол большэвіцкай партыі і вялікага Сталіна, мы гатовы ўсе, як адзін, выступіць на абарону нашай краіны. Калектыў дэпо Гомель з чэсцю выканае свой абавязак перад радзімай.

Каля 500 чалавек прысутнічала на мітынгу ў гомельскім вагонным участку. Каваль-стаханавец тав. Савенкаў у сваім выступленні заявіў:

— Наш сталінскі нарком тав. Лазар Майсеевіч Кагановіч даў абяцанне таварышу Сталіну і XVIII з'езду партыі, што, калі спатрэбіцца, чыгуначнікі з чэсцю справяцца з задачай абаронных перавозак. Мы, чыгуначнікі пагранічнай магістралі, на выдатна выканаем гэту баявую задачу.

У сваёй рэзалюцыі калектыў вагоннага ўчастка горача вітае мудрую сталінскую палітыку нашага ўрада і абавязуецца шырэй разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва і забяспечыць узорнае прасоўванне паяздоў.

Чыгуначнікі пагранічнай магістралі бяруць на сябе канкрэтныя абавязацельствы на далейшаму разгортванню стаханаўскага руху і баявой падрыхтоўцы да зімы.

Р. СЫРКІН.

НАНЯСЕМ САКРУШАЛЬНЫ ЎДАР ВОРАГУ

(Рэзалюцыя калектыва рабочых і служачых завода імені Кірава)

ВІЦЕБСК, 17 верасня. Заслухаўшы інфармацыю аб паведамленні главы Совецкага ўрада і Народнага Камісара Замежных Спраў тав. Молатава аб мерапрыемствах совецкай дзяржавы па абароне інтарэсаў народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў сувязі з поўным банкроцтвам польскага ўрада, — мы, рабочыя і служачыя віцебскага станкабудаўнічага завода імені Кірава, цалкам і поўнасцю адабраем мерапрыемствы нашага Совецкага ўрада.

Мы запэўняем нашу партыю, Совецкі ўрад і правадыра народаў вялікага Сталіна, што па першаму закліку партыі і ўрада усе, як адзін, выступім на абарону нашай квітнеючай радзімы і нанясем сакрушальны ўдар любому агрэсару, усім тым, хто паспрабуе нарушыць нашу мірную праму, наша ўсёперамагаючае шэствіе ўперад, да комунізма.

КРЫНІЦА ВЫСОКІХ ДАХОДАЎ

ГРЭСК. У калгасе «Чырвоны пуцілавец», Пакаршаўскага сельсовета, грамадская жывёлагадоўля стала адной з асноўных крыніц высокіх даходаў. Толькі за апошнія чатыры годы пагалоўе буйнай рагатай жывёлы калгаса вырасла ў 4 разы, пагалоўе коней і свіней—у 2.5 раза.

У мінулым годзе жывёлагадоўля калгаса дала 68.395 рублёў чыстага даходу. Сёлета даходы ад жывёлагадоўлі складуць звыш 100 тысяч рублёў.

За грамадскай жывёлай калгаса наладжан узорны догляд. Гэта забяспечыла атрыманне высокіх удояў і высокаякаснай прадукцыі. У 1938 годзе ў сярэднім на кожную фуражную карову ўдой складаў 2.856 літраў малака. Сёлета ўдой на кожную карову будзе роўны 3.750 літраў.

Грамадская жывёла калгаса ўтрымліваецца ў добра абсталяваным памяшканні са спецыяльнымі кармушкамі, каналізацыяй і электрычным асвятленнем. Кармленне жывёлы праводзіцца строга па рацыёну, уведзен пастаянны ўнутраны распарадак.

ЭЛЕКТРЫФІЦЫРАВАНА 45 КАЛГАСАЎ

ОРША. **(Кар. «Звязды»).** Сацыялістычная сельская гаспадарка раёна з кожным годам усё больш і больш узбройваецца першакласнай машыннай тэхнікай. На тэрыторыі раёна працуюць 4 машынна-трактарныя станцыі з вялікім паркам складаных сельскагаспадарчых машын.

На прасторных калгасных палях працуюць 159 магутных трактараў, 36 камбайнаў, 32 ільноцерабілкі, сотні складаных малатарань і жнярак.

Непазнавальнай стала калгасная вёска. Калгасы жывуць культурна і заможна. Толькі за апошнія годы яны за свае сродкі набылі 66 аўтамашын, устанавілі 47 нафтавых рухавікоў і 99 электраматораў, агульнай магутнасцю ў 925 кіловат.

З прасторных і заможных хат калгаснікаў навечна знікае карасінавая лямпа. Яе замяняе яркае святло электрычнасці. У раёне поўнасцю ўжо электрыфіцыравана 45 калгасаў. 4028 лямпачак Ільіча ярка гараць у дамах калгаснікаў.

У культурным жыцці калгаснікаў радыё становіцца першэйшай неабходнасцю. У раёне прымаюцца ўсе меры для пашырэння радыёсеткі. У 32 калгасах ужо ўстаноўлена 850 радыёкропак.

Балоты ператвораны ў квітнеючыя палі

МОЗЫР. Непраходнымі былі раней балоты на тэрыторыі калгаса «Чырвонай Дубровы». Калгаснікі рашылі прымусіць балоты даваць багатыя ўраджаі. Пачалася асушка, хутка паявіліся роўныя жанавы, па якіх сцякала вада. Пасля пачалі акрэпліваць асушанае балота і сеяць на ім хлябы.

На асушаных землях калгас у гэтым годзе зняў высокі ўраджай. З кожнага гектара сабрана па 18 цэнтнераў аўса. Дабіліся асабліва добрых ураджаяў проса. У сярэднім з кожнага гектара атрымана па 25 цэнтнераў проса. Усяго ў калгасе асушана 100 гектараў балот.

З кожным днём паляпшаецца добрабыт калгаснікаў. Сям'я стаханаўца А. Е. Тарасевіча выпрацавала ў мінулым годзе 913 працадзён і атрымала 500 кгр. проса, 1800 кгр. зернавых, 1300 рублёў грашыма. Сёлета працадзень будзе яшчэ больш каштоўным.

У ДОМЕ КУЛЬТУРЫ

АСІПАВІЧЫ. У бягучым месяцы на экране гарадскога Дома сацыялістычнай культуры будуць дэманстравацца гукавыя мастацкія кінофільмы: «Гарнякі», «Друзья встречаются вновь», «Богатая невеста», «Честь», «Друзья», «Подруги» і інш.

У мястэчку Градзянка хутка заканчваецца расшырэнне клуба для рабочых і служачых механізаванага лесапункта. У клубе ўстанаўліваецца новая стацыянарная кіноўстаноўка. Будзе абсталяван радыёвузел.

Жылыя дамы для рабочых-дрэваапрацоўшчыкаў

Скончана будаўніцтва двухпавярховага дома на тэрыторыі рабочага пасёлка Новабеліцкага дрэваапрацоўчага камбіната. На будаўніцтва было расходавана 150 тыс. рублёў.

Добра аддзеланыя кватэры ўжо заселены сем'ямі рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў камбіната.

Днямі закладзен фундамент новага 8-кватэрнага дома.

НОВЫ СЛУЦК

Слуцк да Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі быў глухім правінцыяльным гарадком. Над нізкімі хібаркамі ўзвышаліся купалы цэркваў і манастыроў — ачагоў мракабесся. Гэта быў горад мяшчан, чыноўнікаў, папоў.

Непазнавальным стаў Слуцк за гады совецкай улады. Ён вырас у культурны сацыялістычны горад. Пабудаваны рад прадпрыемстваў, многа жылых дамоў, ясляў, дзіцячых садоў, школ. У апошнія годы на ўпарадкаванне горада зрасходавана 4,5 мільёна рублёў.

Нядаўна Белдзяржпраект закончыў складанне генеральнай схемы планіроўкі горада. Схема зацверджана прэзідыумам гарадскога совета. Планіроўка горада разлічана на 15—20 год. Намячаецца будаўніцтва новых жылых дамоў, культурных устаноў, плошчаў, фізкультурных стадыёнаў, парка культуры і адпачынку, сквера.

У 1940 годзе пачнецца будаўніцтва новай гасцініцы. На плошчы ў 15 гектараў у жывапісная мясцовасці будзе створан парк культуры і адпачынку. На беразе ракі ўзнікне вялікі пляж, лодачная станцыя. Цэнтральны стадыён будзе ўмяшчаць 5 тысяч чалавек.

Вялікае развіццё атрымае мясцовая прамысловасць. Намячаецца пабудова мясакамбіната, птушкакамбіната, хлебазавода, плодагародзінасушыльнага і півазварнага заводаў, мэблевай фабрыкі, чыгуналіцейнай механічнай майстэрні і інш.

Ужо ў бліжэйшыя годы жыллёвы фонд горада павялічыцца на 11.5 тысячы кв. метраў, у цэнтры горада вырастуць прыгожыя трохпавярховыя дамы. Праект прадугледжвае пабудову вадаправода і каналізацыі, коштам у 4.5 мільёна рублёў. Першая чарга пачне будавацца з 1940 года. Вуліцы горада пакрыюцца асфальтам і будуць азеленены.

З культурных устаноў намечана пабудова кінотэатра, будынка гарадскога тэатра і музыкальнай школы.

БАГАЦЦЕ ПРАДУКТАЎ НА РЫНКУ

МСЦІСЛАЎЛЬ. 17 верасня. З кожным днём на калгасным рынку Мсціслаўля павялічваецца прывоз сельскагаспадарчых прадуктаў. Атрымліваючы на свае працадні вялікую колькасць збожжа, гародніны і іншых прадуктаў, калгаснікі напаўняюць імі рынак.

У апошні час значна зніжаюцца цэны на прадукты. Так цэны на мяса знізіліся на 15 проц., на яйкі на 25 проц. садавіну і гародніну на 20 проц. На выручаныя грошы калгаснікі набываюць сабе мэблю, патэфоны і іншыя промтавары.

В. ПЫЖКОЎ.

—★—

Высокі ўраджай ільносемя

ДУБРОЎНА. Выдатных разультатаў у павышэнні ўраджайнасці ільну і ільносемя дабіліся звеннявыя калгаса «Чырвоная Паляна», Цілявіцкага сельсовета, тт. Аўтаненка і Мужылоўскі. Звяно тав. Мужылоўскага атрымала ў гэтым годзе 10 цэнтнераў ільносемя з гектара, а тав. Аўтаненкі — 8 цэнтнераў. Зараз звеннявыя старанна даглядаюць ільнотрасту на сцелішчах. Мяркуецца атрымаць па 10 цэнтнераў ільновалакна з гектара.

Майстры мастацкай вышыўкі

МАГІЛЕЎ. 30 майстраў мастацкай вышыўкі і ткацтва вобласці рыхтуюць экспанаты для надыходзячай абласной мастацкай выстаўкі.

Асаблівую цікавасць праяўляе творчасць выдатнай майстрыцы мастацкага ткацтва калгасніцы з Бабруйскага раёна Феадосіі Іванаўны Ліцкевіч. Некаторыя з яе работ прадстаўлены на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Для абласной выстаўкі тав. Ліцкевіч рыхтуе вялікае панно на тэму «Шчаслівае і заможнае жыццё беларускага народа».

Хатняя гаспадыня Лукер'я Іванаўна Зубкова (Дрыбінскі раён) рашыла вышыць партрэт вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна і панно «Пагранічнік у дазоры».

У выстаўцы прыме ўдзел кіраўнік вышывальнага гуртка Магілеўскага аўтарамонтнага завода Ольга Паўлаўна Мохава. Яна працуе над партрэтам таварыша Сталіна.

На імя выстаўкома атрымана пісьмо ад жыхаркі Магілеўскай вобласці, зараз студэнткі Ленінградскага інстытута сельскагаспадарчых машын Ольгі Аляксееўны Карпенка. Яна хоча паказаць на выстаўцы мастацкія каўры сваёй работы.

Выдатныя трактарысты

БУДА-КАШАЛЁВА. Разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі, трактарысты Будакашалёўскай машынна-трактарнай станцыі дабіліся ў бягучым годзе выдатных вынікаў у сваёй рабоце. Камбайнер Іосіф Бажычка, узнагароджаны медаллю «За трудовое отличие», за час уборкі азімых і яравых культур на паўднёвым камбайне ўбраў 437 гектараў, пры норме ў 200 гектараў. Трактарыст Даніла Каткоў на трактары «ЧТЗ» апрацаваў за сваю змену 339 гектараў. Трактарысты Лісейчыкаў, Аніскоў і Авер'янаў апрацавалі па 337 і больш гектараў. Трактарыст Іван Сікорскі, працуючы на трактары «ХТЗ», узараў 298 гектараў і выцерабіў 84 гектары ільну, пры норме 36 гектараў.

Радыёфікацыя калгаснай вёскі

ПРАПОЙСК. У раённым цэнтры заканчваецца мантаж апаратуры новага радыёвузла на 5 тысяч радыёкропак. Радыёвузел будзе здан у эксплаатацыю і кастрычніка бягучага года. Да дваццаць другой гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі будуць радыёфіцыраваны калгасы «Чырвоны баявік», імені Варашылава, імені Максіма Горкага, «Чырвоны будзёнавец», «Памяць Леніна» і іншыя.

Сям'я стаханаўца—калгасніка сельгасарцелі «Чырвонае світанне» (Хойніцкі раён, Палескай вобласці) А. М. Зубка, якая складаецца з трох дачок і сына, выпрацавала да першага ліпеня 900 працадзён. За сваю чэсную калгасную працу сям'я атрымала ў аванс 10 цэнтнераў жыта. На здымку: А. М. ЗУБОК ў кругу сям'і і гасцей святкуе імяніны ўнука Валодзі.

Фото Б. М. Хеніна (Фотахроніка БЕЛТА)

АДНАДУШНАЕ АДАБРЭННЕ

З вялікай увагай і затаеным дыханнем слухаў двухтысячны калектыў чырвонасняжнай швейнай фабрыкі «Кастрычнік» паведамленне па радыё главы Совецкага ўрада Вячэслава Міхайлавіча Молатава аб рашэнні ўрада аказаць брацкую дапамогу ў барацьбе за сваё вызваленне працоўным Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

У сваім выступленні механік фабрыкі т. Капілевіч пад гукі адабрэння ўсяго мітынга вітае прынятае ўрадам рашэнне і заклікае рабочых калектыў яшчэ больш мабілізавацца на выкананне вытворчых планаў, набываць і ўдасканальваць ваенныя веды.

— Уважліва слухала я па радыё выступленне таварыша Молатава,—гаворыць стаханаўка трэцяга цэха т. Карнялеўская.—і з гордасцю заяўляю, што я, як і ўсе працоўныя нашай краіны, горача адабраю рашэнне, прынятае Совецкім Урадам. Мы ўпэўнены ў тым, што наша доблесная Чырвоная Армія з чэсцю выканае ўскладзеныя на яе адказныя задачы і вызваліць нашых братоў па класу ад панскага гнёту.

З свайго боку мы, рабочыя, абавязаны яшчэ лепш працаваць, яшчэ больш упорна змагацца за колькаснае і якаснае выкананне промфінплана, дасканала авалодваць ваеннымі ведамі, каб у патрэбны момант стаць на абарону сваёй любімай квітнеючай радзімы.

У прынятай рэзалюцыі двухтысячны калектыў фабрыкі горача адабрае мудрае рашэнне партыі і Совецкага ўрада і абавязуецца датэрмінова закончыць вытворчую гадавую праграму.

ЯШЧЭ БЫСТРЭЙ ЗАПРАЦАВАЛІ СТАНКІ

На фабрыцы раздаўся гудок. Работа першай змены закончана. Павінна прыступіць другая змена, але рабочыя асталіся ля станкоў. Светлы, прасторны закройны цэх мінскай абутковай фабрыкі імені Кагановіча запоўніўся рабочымі, служачымі і інжынерна-тэхнічнымі работнікамі. На мітынг з'явіліся 1.200 чалавек.

На трыбуне тэхнічны кіраўнік фабрыкі тав. Шэнькер.

— Таварышы рабочыя, работнікі і інжынерна-тэхнічныя работнікі, — гаворыць тав. Шэнькер,—многія з вас слухалі выступленне па радыё главы Совецкага ўрада, Народнага Камісара Замежных Спраў Вячэслава Міхайлавіча Молатава.

Тав. Молатаў аб'явіў народам Совецкага Саюза аб тым, што камандванню Чырвонай Арміі аддан загад дапамагчы нашым братам Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, якія ўзнялі сцяг барацьбы за сваё вызваленне, супроць польскіх памешчыкаў і капіталістаў. На нашу долю выпала вялікая гістарычная місія—дапамагчы нашым братам па класу.

Сабраўшыеся ў адзіным парыве ўстаюць. Раздаюцца гучныя апладысменты, крыкі «ура» ў чэсць нашай доблеснай Чырвонай Арміі і яе выдатнага палкаводца Клімента Ефрэмавіча Варашылава. «Няхай жыве наш дарагі і любімы Сталін!» «За партыю, за Сталіна не пашкадуем свайго жыцця!»—праносіцца па ўсяму цэху.

Слова напрасіў інжынер-тэхнолаг тав. Акіньшын.

— Больш дваццаці год працоўныя Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, — гаворыць ён, — знаходзіліся пад гнётам польскіх памешчыкаў і капіталістаў, якія, як павукі, высмоктвалі апошнія соки і кроў з сялян і рабочых.

На нашу долю выпала вялікае шчасце вызваліць нашых братоў. Мы павінны на вытворчасці працаваць так, каб даказаць нашай партыі і ўраду сваю вялікую любоў і адданасць радзіме. Мы гатовы ў любую мінуту пайсці ў рады нашай Чырвонай Арміі.

З вялікім натхненнем і пачуццём патрыятызма выступіў стаханавец-прызыўнік тав. Папыленка.

— Будучы на фабрыцы, я авалодаў ваеннымі ведамі. Мае два браты ўжо служаць у радах нашай доблеснай Чырвонай Арміі. Я вельмі задаволены тым, што скора і я далучуся да іх. За нашу радзіму, за таварыша Сталіна не пашкадую свайго жыцця!

Рабочыя фабрыкі прынялі рэзалюцыю, у якой сказана:

«Захоўваючы поўны спакой, арганізаванасць і дысцыпліну, мы абавязуемся яшчэ лепш працаваць, шырэй разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва, стаханаўскі рух, павысіць якасць і знізіць сабекошт нашай прадукцыі.

Заяўляем, што мы ўсе, як адзін, па першаму закліку партыі і ўрада гатовы стаць на абарону нашай шчаслівай краіны, краіны сацыялізма, гатовы аказаць усямерную дапамогу нашым братам і сёстрам Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі».

Р. СІМКІНА.